# «Маем вялікае самі…»: кнігадрук на Беларусі

**Л. А. Рабчынская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
Брэсцкага абласнога ліцэя імя П. М. Машэрава
**А. В. Навасяльчан,**
намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце
Брэсцкага абласнога ліцэя імя П. М. Машэрава

***Гучыць беларуская сярэдневяковая музыка.***

**Уступ.** Пра людзей мы мяркуем па справах, якія яны здзейснілі, па спадчыне, якую яны пакінулі сваім нашчадкам. І наш славуты зямляк Францыск Скарына ў гэтым сэнсе найярчэйшы прыклад. Ён з'яўляецца сімвалам усёй беларускай культуры эпохі Адраджэння. У асобе Францыска Скарыны талент даследчага вучонага, мудрага асветніка і вялікага патрыёта роднай зямлі шчасліва спалучаўся з талентам выдатнага паэта і мастака.

Скарына – першы, хто адкрыў ва Усходняй Еўропе кнігадрукаванне і зрабіў кнігу даступнай вялікаму колу людзей. Скарына – наш гонар і слава, бо яго нарадзіла і ўскарміла менавіта наша беларуская зямля.

***На экране партрэт Ф. Скарыны, а голас за сцэнай.***

**Вядучы 1**. Дзень 6 сакавіка 1486 г. запомніўся ўсім тады ў Полацку. Ды і не толькі ў Полацку.

**Вядучы 2.** Ранішняе сонца раптам пачало засланяцца цемраю. Людзі з жахам глядзелі, як яно ўсё меншала і меншала. Ці не канец свету? *(Святло ў зале гасне.)*

**Вядучы 3**. Чорны цень хутка бег па зямлі. Раптам зусім сцямнела. Набожныя пачалі маліцца *(Чуюцца званы.)*

**Вядучы 4.** Гулка бухалі званы полацкіх сабораў. Суцэльная цемра схавала ўсё. І людзі адчулі страшэнны холад.

**Вядучы 1**. Але праз хвіліну сонца зноў выбліснула. І ўсе ўсцешна ўздыхнулі. (*Святло запальваецца, на сцэне на ўслончыку сядзіць Скарына*.)

**Вядучы 2**. Якраз у гэты час у жонкі праваслаўнага купца Лукі Скарыны нарадзіўся сын і назвалі яго Францыскам.

**Вядучы 4.** Бабка-павітуха прыгаворвала, прылажыўшы да яго пяткі кавалак паперы:
Хай будзе вельмі вучоным малайцом!
Хай ён будзе ў бацьку – купцом!

**Скарына.**
Я гандляваць не буду, як Іван.
Хай Бог дапамагае вам з Іванам,
Дай Бог здароўя маці і радні:
У Кракаў я з купецкім караванам
Вучыцца еду.
Маю душу запаланілі кнігі:
Яны і днём і ноччу сняцца мне,
Лічу я кнігі скарбамі сваімі.
Хачу, каб непісьменнасці імгла
Святло, што выпраменьваецца імі,
Не зацямніла, не перамагла.

***На сцэне з’яўляецца герб Скарыны.***

**Вядучы 1.** І як успамін аб гэтым дні на гравюрах кніг, выдадзеных «Франціском Скориною из славного града Полацка», будзе сустракацца сонечны дыск, прыслонены паўмесяцам – герб друкара Скарыны.

***Дэманструецца відэа.***

**Вядучы 2.**

Сёння мы ўспамінаем Францыска Скарыну,
Што радзіўся калісь над Дзвіною,
Вандраваў над яе берагамі,
Што аправіў мужычую мову
У неўміручы гнуткі пергамент. (*Алесь Дудар*)

**Вядучы 3.**

Марыў калісьці славуты Скарына,
Ціснучы кнігі на мове бацькоў:
Простаму люду ў роднай краіне
Зробіць даступнай ён мудрасць вякоў.

**Вядучы 4.**

Першадрукар тварыў, прарочыў
І час дарэмна не змінуў:
Аззяла кніга людзям вочы,
Адкрыўшы праўду і ману!

**Вядучы 1.**

Ён першы кнігу даў славянам,
На простай мове ўзорны ліст.
Ён знаў: з-за хмараў валавяных
Праб’ецца сонца на зямлі.

**Вядучы 2.**

Успомні Прага, час той, як ля станка друкарскага карпеў ён,
Нібыта апантаны.
Успомні ты…
На мове роднай, велічнай і спеўнай
Ён здзіўленаму свету даў «Псалтыр».
**Скарына.**
Кожная краска  ўсцілае сваю сцяжыну палявую.
Кожнае дрэва скідае ліст свайму долу.
Кожная пчолка прыносіць мёд у свой вулей.
Дык ці ж я мог сваіх кніг не прынесці дадому?
З літар, як з кропелек поту, збіраў я свае першадрукі
Не для цароў венцаносных,
А для цябе, светласэрдны мой люд.

**Вядучы 3.**

Нямала народаў з крыніц  яго піла,
І брала ад мудрасці вечны агонь,
У літарах  першых знаходзячы сілу…
Ты слаўна, зямля, што вякам нарадзіла
Такога выдатнага сына свайго!      *( П. Броўка)*

***Верш  «Кантрабанда» чытаюць 3 вучні.***

**Вядчы 1.**

Скарына кніжнай мудрасці сабраў вялікі плён,
Блішчэла слова золатам, іскрылася, свяціла,
Наперад рвалася за шчасцем наўздагон,
Ад цемры векавечнай і глухой будзіла.

**Вядучы 2.**  У сваіх кнігах Францыск Скарына змяшчаў прадмовы, пасляслоўі, малюнкі, гравюры, малітвы. Вось адна з іх, якая сцвярджае вечныя ісціны і каштоўнасці.

**Вядучы 3.** « Да подай нам на землю мир,

Грехам очищение, немощным здравие, смутным потешение, ненадежным надежду, вопиющим за веру Христову победу, Пленникам избавление,

Нагим одеяние, сиротам хлебокормление, по морю плавающим тишину, во путь шествующим пристанище, обидимым споможение, и всем христианам спасение, а по смерти царство небесное, яко один человеколюбец и Бог наш».

**Вядучы 4.** Вялікі сын полацкай зямлі Францыск Скарына сканцэнтраваў у сабе, з аднаго боку, усе дасягненні ўсеславянскай культуры, з другога боку, ён увасабляў сабою тып тытана эпохі Адраджэння. Яго можна параўнаць з такімі магутнымі постацямі, як Леанарда да Вінчы, Эразм Ратэрдамскі, Рафаэль.

**Вядучы 1.** У тэкстах Біблii асветнік Скарына паўстае чалавекам, які садзейнічае пашырэнню пісьменнасці, ведаў. Аб гэтым сведчаць такія радкі: «Усялякаму чалавеку трэба чытаць, бо чытанне – люстра нашага жыцця, лекі для душы».

**Вядучы 2.** Скарына пакінуў і свой маральны запавет у наступных радках, якія змяшчаюць мудрасць чалавечага жыцця і ўзаемаадносін людзей: «Закон прироженный в том наболей соблюдаем бывает: то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хочеши от иных имети…».

**Вядучы 3.** Францыск Скарына – пачынальнік новага разумення патрыятызму як любові і павагі да сваёй Бацькаўшчыны. З патрыятычных пазіцый ўспрымаюцца наступныя яго словы: «Понеже от прирождения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя, птицы, летающие по воздуху, ведають гнезда своя; рібы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя; пчёлы и тым подобныя боронять ульев своих, - тако же и люди, где зароділіся и ускормлены суть по бозе, к тому месту велікую ласку мають».

**Вядучы 4.** Беларускае кнігадрукаванне пачалося адразу на еўрапейскім узроўні. Рэнесансныя выданні Францыска Скарыны вылучаюцца высокай якасцю друку, характэрнымі мастацкімі, гравюрнымі і арнаментальнымі ўпрыгожваннямі, шрыфтам і іншымі кампанентамі выдавецкай эстэтыкі і майстэрства. А каментарыі да выданняў былі разлічаны на ўспрыманне простымі (паспалітымі) людзьмі.

**Вядучы 1.** У прамовах Скарыны прасочваюцца прыметы іншых літаратурных жанраў, якія пазней атрымалі развіццё ў беларускай літаратуры і пісьменнасці.

**Вядучы 2.** Кнігі Скарыны аказалі значны ўплыў на духоўную культуру Беларусі і Украіны, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай дзяржаве, распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях.

**Вядучы 3.** А пачынальнікамі славянскай пісьменнасці былі Кірыла і Мефодзій: яны стварылі першы славянскі алфавіт, пераклалі евангельскія прытчы, пропаведзі, пасланні і богаслужэбныя тэксты на славянскую мову, адукоўвалі славян, навучалі грамаце, стваралі школы. Зараз наша азбука з'яўляецца самай простай і зручнай. У ёй – 33 літары.

**Вядучы 4.** Традыцыі, закладзеныя Кірылам, Мяфодзіем і Скарынам, набылі адразу ж пашырэнне не толькі у Беларусі, але і ў Расіі і Украіне. Працягвалі справу кнігадрукавання браты Кузьма і Лукаш Мамонічы, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Пётра Мсціславец, Афанасій Філіповіч, Мялецій Сматрыцкі, Іван Фёдараў.

***Дэманструюцца партрэты паслядоўнікаў Скарыны.***

**Вядучы 1.** У наш час яе Вялікасць Кніга мае незвычайную моц. Верная і надзейная, добрая і мудрая, яна дае нам веды, напаўняе жыццё сэнсам, умее суцешыць і падтрымаць, дапамагчы і парадзіць, адказаць на любое пытанне, адкрыць любую таямніцу, вывесці з цемры да святла.

***Выносяцца кнігі, дэманструюцца, ставяцца на п'едэстал гонару.***

**Вядучы 2.**

Ён даў нам, беларусам, чаканую кнігу
Не на тое, каб вэрхал кіпеў кірмашовы,
Не на гвалт, не на здзек, не на посмех барыгу,
А каб мы не цураліся роднае мовы.

**Скарына.** Любіце і шануйце роднае слова, з якім вас Бог на свет пусціў.

**Вядучы 3.** Нашы людзі, удзячныя нашчадкі Францыска Скарыны, памятаюць подзвіг свайго славутага першадрукара.

**Вядучы 4.** Яго імя носяць навучальныя ўстановы і вуліцы, бібліятэкі і грамадскія аб'яднанні. Помнікі размешчаны ў Полацку, Мінску, Лідзе, Калінінградзе, Празе

**Вядучы 1.** У гонар Скарыны зацверджаны вышэйшыя ўзнагароды Беларусі: ордэн і медаль. Такія ўзнагароды маюць і нашы берасцейцы: ордэн Францыска Скарыны – мастак Мікалай Кузьміч, кіраўнік ансамбля «Радасць» Анатоль Варабьёў, вядомы ва ўсей краіне Уладзімір Лявонцьевіч Бядуля; медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны педагогі Брэсцкага музычнага каледжу Лілія Батырава, Людміла Жабінская і Мікалай Алданаў, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта Вера Зарэцкая, артыстка лялечнага тэатра Тамара Цевасян, акцёры Брэсцкага тэатра драмы Тамара Ляўчук і Міхаіл Мятліцкі, пінскі журналіст Валерый Грышкавец, бібліёграф Брэсцкай абласной бібліятэкі Зінаіда Патлава, дырэктар Брэсцкага гарадскога ліцэя №1 Святлана Сямёнава, дырэктар сярэдняй школы № 20 Ірына Нікіфаравец.

**Вядучы 1.**

Асветнік, вучоны
І першадрукар,
Наш гонар –
Францішак Скарына.
**Вядучы 2.**

Запомні ўсім сэрцам
Як велічны дар
Радзімы
Славутага сына.
**Вядучы 3.**

Праклаў ён дарогу
Да Слова, Святла,
За матчыну Мову
Паклікаў змагацца,

**Вядучы 4.**

Каб вольнай заўсёды
Між вольных магла
Дзяржаваю
Белая Русь
Называцца. *(М. Пазнякоў.)*

***Гучыць песня «Я не ганю землі чужыя… ».***